View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

Т.Я. Старасценка

# ТЭСТ

## Сінтаксічныя канструкцыі з чужой мовай

## Варыянт 1

Тэст А

**А1.** Адзначце асноўныя прыкметы ўскоснай мовы:

□ 1) сэнсавая незавершанасць;
□ 2) перадача толькі асноўнага зместу выказвання пэўнай асобы;
□ 3) эмацыянальнасць;
□ 4) суаднесенасць са складаназалежным сказам;
□ 5) адметнае пунктуацыйнае афармленне.

**А2.** Адзначце ўрыўкі з простай мовай:

□ 1) “Ідзі, мая кароўка, у зялёную дуброўку, каб пад сонейкам хадзіла, пад месячкам не блудзіла”, -- так выпраўлялі мы сваю малачаўніцу ў поле.

□ 2) Апошні час у яго на душы было неспакойна. Хто ён цяпер? Без пяці хвілін камандзір узвода.

□ 3) – Выбачайце, -- нарэшце сказаў я, -- дзе тут каралеўскі палац?

□ 4) Алесь падумаў: “Немагчыма стварыць для сябе ціхі аазіс, нейкае схovішча, куды не прыйдуць трывогі часу”.

□ 5) Пісьменнік гаворыў, што адной з рыс індыйскага характару з’яўляецца адчуванне ўласнай годнасці.

**А3.** Адзначце знак прыпынку, які трэба паставіць замест пропуску:

“Вясною_--марыць Валік, -- вернецца наша птушка ў родны край”.

□ 1) кропка,
□ 2) коска;
□ 3) двукроп’е;
□ 4) двукоссе;
□ 5) клічнік.

**А4.** Адзначце правільныя варыянты афармлення цытаты:

□ 1) Даследчыца літаратуры Галіна Зенава зазначае, што “эвалюцыя жанру беларускага апавядання – заканамерны працэс”.

□ 2) У адным са сваіх вершаў Л.Дайнека пісаў:

“Сярод слоў, як сярод лясоў,
Як сярод шумлівых дуброваў,
Заўважаю я зноў і зноў
Адзіноту пяшчотнага слова”.

□ 3) Верш Янкі Купалы “Перад будучыняй” – гэта таксама “аўтарская споведзь-маналог”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

☐ 4) Кузьма Чорны зазначаў, мова і стыль – тыя формы, у якіх падаецца чытачу думка твора.

☐ 5) У П.Макаля ёсць такія радкі:

-- “Прымаю па складу, па смаку, па гуку
Мову маю матчыну!”

**А5.** Адзначце схему, якая адпавядае пастаноўцы знакаў прыпынку ў сказе:

Бачыш вунь тую самую высокую вяршыню (П, п)аказвае мне Ахмет (Я, я) там многа год авечак пасвіў.

☐ 1) “П, -- а, -- п”.
☐ 2) “П! – а, -- п”.
☐ 3) “П... – а. – П”.
☐ 4) “П? – а. – П”.
☐ 5) “П! – а. – П!”

**А6.** Адзначце сказы з пунктуацыйнай памылкай:

☐ 1) – Добры дзень вам!, ветліва павіталася жанчына.

☐ 2) Сымонка збіраў маленькіх шчупакоў і плотак па лужынах, кідаў у вядро і нёс да возера, прыгаворваючы: “Плывіце і расціце!”

☐ 3) – Тобік, Тобік, -- лашчыў пярэстага сабачку дзед. Ідзі, маленькі, пабегай.

☐ 4) Дзяўчына раптам думае: што трэба забыць крыўды і непрыемнасці.

☐ 5) Якраз у гэты момант Сяргей пачуў цокат конскіх падкоў па бруку, знаёмае, хоць і не дужа моцнае, “ура!” і стрымгалоў выскачыў з хаты.

Тэст В

**В1.** Прадоўжыце сказ:

Чужая мова, якая перадаецца даслоўна, з захаваннем сінтаксічных асаблівасцей, называецца □□□□□□□□□□□□□□□□□.

**В2.** Прадоўжыце сказ:

Канструкцыя з простай мовай набліжаецца да такога тыпу складанага сказа, як □□□□□□□□□□□□□□□□□.

**В3.** Запішыце знак прыпынку, які ставіцца на месцы пропуску.

“Нават адным словам, якое жыве, а не існуе, -- пісаў Кузьма Чорны_ -- (М,м)ожна вельмі шмат выказаць”.

□□□□□□□□□□□□□□□□□.

**В4.** Устанавіце адпаведнасць сказаў з правільным варыянтам пастаноўкі знакаў прыпынку. Адказ запішыце.

А. Не забывай мяне сказаў на развітанне Турсевіч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Б. Міхась адзначыў, што зямля, як жывая, гаворыць з небам і варушыцца пад нагамі.

В. Шчымліва падумалася хіба я на свеце знайду пекнату як тут на Беларусі?

Г. А ў вас дзеці ёсць?

Дзве паненкі адказваю.

1) Працяжнік, працяжнік, коска, працяжнік;
2) двукоссе, двукоссе, коска, працяжнік;
3) двукроп’е, двукоссе, працяжнік, двукоссе;
4) двукроп’е, двукоссе, коска, коска, двукоссе;
5) коска, коска, коска.

□□□□□□□□□□□□□□□□□.

**Варыянт 2**

Тэст А

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А1.** Адзначце асноўныя прыкметы няўласна-простай мовы:

□ 1) перадача чужога выказвання ад аўтарскага імя;
□ 2) суаднесенасць толькі са спалучэннем слоў;
□ 3) бярэцца ў двукоссе;
□ 4) пішацца з новага радка;
□ 5) перадача думак, пачуццяў, перажыванняў персанажа.

**А2.** Адзначце ўрыўкі з ускоснай мовай:

□ 1) Валік прызнаваўся маёй маці, што не можа жыць без кніг.

□ 2) Дзядзька Сымон спытаў, дзе ў тыя суровыя дні барацьбы знаходзіўся партызанскі лагер.

□ 3) Сам сабе Ігнат Карлавіч падумаў: будзе здароўе, папрацуе яшчэ. Якое іначай яму жыццё без школы, без дзяцей і настаўнікаў? Як ён выседзіць седзьма дома?!

□ 4) Ян Райніс як быццам і пра нас гаварыў: “Усміхніся – горыч знікне”.

□ 5) Алена сказала, што нікуды не спяшаецца, а наадварот, чакае адказу на сваё пытанне.

**А3.** Адзначце знак прыпынку, які трэба паставіць замест пропуску:

-- Пабудзем яшчэ ў лесе! – хлопчык падбег да бацькі_ – (Т,т)ут столькі ягад!

□ 1) коска;
□ 2) двукроп’е;
□ 3) кропка;

□ 4) кропка з коскай;
□ 5) пытальнік.

**А4.** Адзначце правільныя варыянты афармлення няўласна-простай мовы:

□ 1) Ён прыслухоўваўся да начной цішыні. Дзе ж тыя знаёмыя з дзяцінства гукі?

□ 2) Багушэвіч стаў пад клёнам, на светлай мясціне. “Як лёгка і хвалююча-хораша тут!”

□ 3) У хату завітвае Рудзька, які выказвае да зайчыка цікавасць.

□ 4) Іван дарогу помніў. Праўда, спытаў у дзяжурнага па станцыі: як выйсці на бальшак?

□ 5) Войцік услухаўся ў лясны шум. Можа пайсці назад ды знайсці тую самую сцежку?.. Усё ж яна павінна кудысь вывесці.

**А5.** Адзначце схему, якая адпавядае пастаноўцы знакаў прыпынку ў сказе:

Яначка (Д, д)обра так усміхаецца Суханкулі (У, у) нас чай не поўную чашку наліваюць.

□ 1) “П, -- а. -- П”.
□ 2) “П, – а, -- п”.
□ 3) “П? – а. – П?”
□ 4) А: “П!”
□ 5) “П! – а. – П”.

**А6.** Адзначце сказы з пунктуацыйнай памылкай:

□ 1) Маці кіўнула партрэту галавою і яшчэ раз пажадала:
-- Дабранач, сынку.

□ 2) – А вы адкуль прыехалі? узрадавана пытаюся я.

□ 3) Глядзеў на аленя і думаў, што ідзе верасень – пара гону, дзе аленю трэба будзе адстойваць сваю годнасць.

□ 4) Туркменская маці, у вялікім замілаванні лашчачы сваіх дзяцей, гаворыць: Вёсачка ты мая!

□ 5) Васіль згадаў – што дзень і сёння будзе пагодны.

Тэст В

**В1.** Прадоўжыце сказ:

Чужая мова, якая перадаецца ад імя аўтара і афармляецца як дадany сказ у складаназалежным, называецца □□□□□□□□□□□□□□□□□.

**В2.** Прадоўжыце сказ:

Канструкцыя з ускоснай мовай набліжаецца да такога тыпу складанага сказа, як □□□□□□□□□□□□□□□□□.

**В3.** Запішыце знак прыпынку, які ставіцца на месцы пропуску.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У Пімена Панчанкі чытаем_

Якія знаёмыя назвы і словы,
Якая цудоўная родная мова!

□□□□□□□□□□□□□□□□□□.

**В4.** Устанавіце адпаведнасць сказаў з правільным варыянтам пастаноўкі знакаў прыпынку. Адказ запішыце.

А. Самая характэрная якасць бяздарнага пісьменніка гаварыў А.П.Чэхаў заключаецца ў тым што ён трымаецца пыхліва.

Б. Тут жыве Ірына Ласніцкая?
Гэта мая ўнучка адказаў мужчына басам. А што вам трэба?

В. Успомніўшы паездку Мікола ледзь не ўздыхнуў радасна ах якія там лясы!

Г. Ганьку даглядайце прасіла Алена і гладзіла па галаве дачку глядзі ж слухай усіх памагай цётцы.

1) Працяжнік, працяжнік, коска, працяжнік, працяжнік;
2) коска, двукоссе, двукоссе;
3) коска, двукроп’е, двукоссе, коска, двукоссе;
4) двукоссе, коска, працяжнік, двукроп’е, працяжнік, коска, коска, двукоссе;
5) двукоссе, коска, працяжнік, коска, працяжнік, коска, двукоссе.

□□□□□□□□□□□□□□□□□□.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Варыянт 3

Тэст А

**А1.** Адзначце асноўныя прыкметы простай мовы:

□ 1) суаднесенасць з простым сказам;
□ 2) у зносцы робіцца спасылка на аўтара;
□ 3) пішацца з новага радка або бярэцца ў двукоссе;
□ 4) даслоўнасць;
□ 5) суаднесенасць са складаным сказам камбінаванай будовы.

**А2.** Адзначце ўрыўкі з няўласна-простай мовай:

□ 1) З космасу, як сцвярджаюць нашы землякі-касманаўты Пятро Клімук і Уладзімір Кавалёнак, Беларусь выглядае зялёнаю-зялёнаю.

□ 2) Заўсёды, калі Андрэй успамінаў маці, сэрца заходзілася болем. Як яна там, бедная, адна?

□ 3) Мой сын расказвае мне казку:
-- Жыў-быў электрычны ток...

□ 4) Глеб вяртаецца дадому. Работу знойдзе, гэта не страшна. Калі пайсці качагарам, то праз гадоў колькі можна выбіцца ў памочнікі, а потым – у машыністы...

□ 5) Кожны, напэўна, ведае, што вяртання назад ужо няма, таму і не пярэчыць свайму лёгкаму суму.

**А3.** Адзначце знак прыпынку, які трэба паставіць замест пропуску:

-- Засумавала па бацьках? Хутка ўбачыш, -- лагодна сказала бабуля і, паглядзеўшы ў вочы малой, дадала_ -- Мама ўжо вярнулася з бальніцы.

□ 1) коска;
□ 2) кропка;
□ 3) кропка з коскай;
□ 4) двукроп’е;
□ 5) шматкроп’е.

**А4.** Адзначце правільныя варыянты афармлення ўскоснай мовы:

□ 1) Пімен Панчанка сцвярджаў, “што заўсёды думаў пра адказнасць паэта”.

□ 2) Максім папярэдзіў, што каля скульптуры ёсць прыступкі.

□ 3) Прыемна і радасна гаварыць, што “ў Мінску многа знакаў народнай удзячнасці героям Вялікай Айчыннай вайны”.

□ 4) Настаўніца спытала ў вучняў, ці дапамагалі яны сваім бацькам улетку.

□ 5) “Зноў будзе дождж”, -- думае стары, пазіраючы на хмары.

**А5.** Адзначце схему, якая адпавядае пастаноўцы знакаў прыпынку ў сказе:

Некаторыя бегаюць з палубы на палубу і ўсё пытаюцца: “Скажыце, дзе танцы?”, а потым уважліва прыслухоўваюцца да гукаў.

□ 1) А: “П?”
□ 2) А: “П?”, А.
□ 3) “П?” – а.
□ 4) А: “П”, а.
□ 5) А: “П?”, а.

**А6.** Адзначце сказы з пунктуацыйнай памылкай:

□ 1) Якая гэта радасць раптоўна пачуць “Мне падабаецца беларуская мова!”

□ 2) Сваё спрадвечнае “выганяй!” пракрычаў пастух.

□ 3) Мама казала, што бабуля вельмі любіла шыпшыну і ў іх пад акном раслі гэтыя кветкі.

□ 4) “Давайце яшчэ паходзім! – Юрась паглядзеў на марскі бераг. “Такі цёплы пясок!”

□ 5) – Паказаць кацяня? – спыталася бабуля і тут жа дадала – Пачакай крыху, я зараз прыйду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

